УДК 726.5 (476)
***Арабей В.Г., БНТУ, Мінск***

## КУЛЬТУРНА-ТУРЫСТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ СУЧАСНЫХ ПРАВАСЛАЎНЫХ ХРАМАЎ ПРЫБУЖЖА

З кожным годам надаецца ўсё большая ўвага развіццю турызма ў Беларусі. Гэтую тэндэнцыю выдатна ілюструюць нацыянальныя праграмы развіцця турызма Рэспублікі Беларусь на 2006-2010 і 2008-2010 гады. Прыбужжа – адзін з рэгіёнаў, у якім гарманічна спалучыўся прыродны каларыт і багатая гісторыка-культурная спадчына, якая складае значную частку турыстычных маршрутаў. У той самы час Прыбужжа можна характарызаваць як рэгіён з праваслаўнай архітэктурай, якая дынамічна развіваецца, але яе турыстычны патэнцыял застаецца нерэалізаваны.

Час стварэння незалежнай дзяржавы супадае з духоўным адраджэннем Беларусі і адносіцца да 90-х гадоў XX ст. Для гэтага перыяду характэрны духоўны ўздым і пошукі новых сродкаў мастацкай выразнасці. У поўнай меры гэта характэрна для архітэктуры, ў тым ліку і праваслаўнай. З аднаго боку, назіраецца цікавасць да архітэктурнай спадчыны, з другога – пошук сучасных вобразных рашэнняў. Абагульняючы гэтыя працэсы, можна вылучыць два асноўныя падыходы храмабудаўніцтва: традыцыяналізм і наватарства.

Для традыцыяналізму характэрны зварот да архітэктурнай спадчыны, выкарыстоўванне як агульных прынцыпаў разнастайных стылістычных накірункаў, так і асобных фрагментаў, дэталяў. Прыкладам гэтага падыходу можна назваць Свята-Серафімаўскі храм у Брэсце, ў якім выкарыстоўваюцца элементы і прыёмы класіцызму; Свята-Іаана-Багаслоўскі храм у в.Чэрні (Брэсцкі р-н) з своеасаблівай трактоўкай маскоўска-яраслаўскага напрамку праваслаўнай архітэктуры XIX ст.; Свята-Георгіеўскі храм у в.Камянюкі (Камянецкі р-н), дзе архітэктар развівае стылістыку мадэрну. Характэрнай рысай традыцыяналізму Прыбужжа з'яўляецца еднасць сучаснай храмавай архітэктуры і праваслаўных пабудоў мінулага.

Наватарскі падыход Прыбужскага рэгіёна з'яўляецца адным з самых яркіх на тэрыторыі Беларусі і характарызуецца шырокім спектрам адмысловых аб'ёмна-прасторавых кампазіцый і вобразных рашэнняў. Як прыклад можна прывесці Свята-Уваскрасенскі сабор у Брэсце і Свята-Ганнінскую царкву ў в. Вял. Матыкалы (Брэсцкі р-н), якія вылучаюцца кампазіцыяй з цыліндрычных аб'ёмаў; храм у гонар абраза Божай Маці «Усіх Смуткуючых Радасць» у Брэсце, дзе характэрныя для праваслаўнай архітэктуры кілепадобныя формы выступаюць у новай трактоўцы; Свята-Іаана-Багаслоўскі храм у в. Прыбарава (Брэсцкі р-н), вобразнае рашэнне якога апелюе да нацыянальных рыс праваслаўнага храмабудаўніцтва.